**Э. К. Дарашэвіч,**
*доктар філасофскіх навук, прафесар*

# ДЫСЦЫПЛІНА «УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ» ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ НОВАЙ ПАРАДЫГМЫ ЭТНАМАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Сацыякультурная рэчаіснасць XXI ст. (глабалізацыя, гіперурбанізм, адкрытасць і даступнасць інфармацыі пра ўсе этнакультуры свету) патрабуе, каб спецыялісты ў розных напрамках этнамастацкай адукацыі (выкладчыкі народнай музыкі, народнай харэаграфіі, народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) мелі не толькі вузкапрафесійныя веды, уменні, навыкі, але і бачылі сваю дзейнасць (этнамастацтва беларусаў) у шырокім культуралагічным, сусветным кантэксце. Сучасная парадыгма этнамастацкай адукацыі ўключае метадалагічна выверануую сістэму ўзаемадзеяння розных бакоў: а) агульнаэстэтычнага і этнакультурнага выхавання; б) агульнай педагогікі і этнапедагогікі; а сам працэс адукацыі (асабліва на першых этапах) павінен ажыццяўляцца выключна на дакументальнай аснове (на матэрыялах мясцовых фальклорных экспедыцый) з улікам непаўторнасці кожнай рэгіянальнай традыцыі. Да таго ж апошнія даследаванні ў тэорыі мастацтва абапіраюцца на: а) дамінанту прэнатальнага фактару ў фарміраванні мастацкага светапогляду [3, с. 88], пры якім вялікую ролю адыгрывае этнічнасць бацькоў будучага дзеяча мастацтва; б) дамінанту архаічных этнаархетыпаў культуры пры фарміраванні індывідуальнага мастацкага стылю асобы [1, с. 39]. Такім чынам, ад этнакультуры ў мастацкай адукацыі пазбавіцца і немагчыма, і немэтазгодна.

На нашу думку, спецыялізацыя «этнафоназнаўства» напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», па якой вядзецца падрыхтоўка на кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, мае асаблівае значэнне ў святле тэмы артыкула. За 10-гадовы перыяд падрыхтоўкі па ёй накоплены значны станоўчы вопыт этнаадукацыі (прызнаны на рэспубліканскім і міжнародным узроўні [4, с. 281]), а менавіта ў галіне сучаснай этнамастацкай адукацыі Беларусь мае найбольшыя магчымасці і нявыкарыстаныя патэнцыі. Што мы маем на ўвазе? У выніку гістарычных і іншых абставін лёс нас скіроўвае на ўсходні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурны напрамак, таму не хапае ні сродкаў, ні магчымасцей грунтоўна распрацоўваць заходнія напрамкі адукацыі. Лёс наканаваў нашай радзіме шукаць свае шляхі ў прыярытэтах і экспарце адукацыйных паслуг. Папярэджваем, гэта не палітапалагічныя ці эканамічныя тэзы, мы застаемся ў межах гісторыі і тэорыі культуры, у нетрах нашай беларускай глыбіннай культуры і яе магчымасцей. У перспектыве нашым брэндам, у тым ліку адукацыйным, будзе народная культура ў шырокім сэнсе, асабліва аўтэнтычны беларускі фальклор.

Аўтэнтыка сёння ўсё больш актуалізуецца для ўсяго свету, і «кожная вывучаная традыцыя (і яе мадыфікацыя, развіццё, сінтэз с сучаснасцю), бясспрэчна, прапануе нешта карыснае для гістарычнага вопыту і стратэгіі выжывання чалавецтва ўвогуле» [2, с. 11]. Але Еўропа, на нашу думку, сёння амаль цалкам страціла ўсё істотнае і «жывое» ў галіне традыцыйнай культуры, таму этнаадукацыя ў рэгіёнах, дзе захаваўся аўтэнтычны фальклор у «жывым» выглядзе (у тым ліку ў Беларусі), становіцца ў перспектыве актуальнай для ўсяго еўрапейскага кантынента.

Усё пералічанае вышэй было ўлічана пры фарміраванні тэматычнага плана па дысцыпліне «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» для студэнтаў напрамку «фальклор», якую мы выкладаем апошнія некалькі год. У межах дадзенай дысцыпліны неабходна пазнаёміць будучых спецыялістаў са спецыфікай універсітэцкай адукацыі, таксама паказаць студэнтам іх перспектывы ў якасці збіральнікаў аўтэнтычнага фальклору, яго захавальнікаў і інтэрпрэтатараў. Ажыццявіць гэта варта не толькі ў мэтах навуковых і дыдактычных, але і ў шырокім практычна-вытворчым аспекце, звязаным з дзейнасцю сучасных дзяржаўных інстытутаў. Таму шмат тэм дысцыпліны прысвечана сувязям фалькларыстаў-практыкаў з дзяржаўнымі ўстановамі культуры і грамадскай супольнасцю. Гэта павінна садзейнічаць усведамленню іх прафесійнай годнасці і адказнасці перад грамадствам.

Акрамя стандартных тэм («Першыя ўніверсітэты», «Правы і абавязкі выкладчыкаў і студэнтаў», «Асаблівасці сучаснага ўніверсітэцкага і студэнцкага самакіравання», «Гісторыя БДУКМ», «Структура БДУКМ», «Спецыфіка работы адміністрацыі ўніверсітэта розных узроўняў», «Формы арганізацыі вучэбнага працэсу ва УВА», «Улік і ацэнка ведаў студэнтаў»,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Асаблівасці навуковай дзейнасці студэнтаў») у дысцыпліне ёсць тэмы, прысвечаныя этнакультуры («Сэнс, камунікацыйныя мэты, інтэнцыі і перспектывы дзейнасці спецыяліста па захаванні фальклору», «Месца практычнай фальклярыстыкі ў галінах дзяржаўных інстытутаў культуры і адукацыі», «Практычная фальклярыстыка як від сацыякультурнай дзейнасці», «Мадэль спецыяліста па захаванні фальклору», «Поспех і якасць прафесійнай дзейнасці спецыяліста па захаванні фальклору»).

Такім чынам, пры выкладанні дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» для студэнтаў напрамку «фальклор» была ўпершыню змадэлявана структура парадыгмы выкладання аналітыкі і агульнай метадалогіі сучаснай творчай дзейнасці для спецыялістаў галіны этнічнай музыкі. Лічым, што трэба дапрацоўваць і ўдасканальваць гэту парадыгму, распаўсюджваць яе на іншыя спецыяльнасці, каб яна стала ўніверсальнай. У той жа час трэба палепшыць каардынацыю паміж узаемадзеючымі дысцыплінамі БДУКМ, напрыклад паміж культурнай антрапалогіяй і культуралогіяй. Сёння трэба даваць фундаментальныя веды па гісторыі і тэорыі культуры, аб узаемадзеянні фальклорнай свядомасці і астатняй культуры. Толькі так можна сканструяваць актуальную новую парадыгму выкладання этнамастацкіх дысцыплін.

---

1. *Алпатова, А. С.* Архаика в мировой музыкальной культуре / А. С. Алпатова. – М. : Экон-Информ, 2009. – 203 с.

2. *Дарашэвіч,* Э. Тэорыя фальклору / Э. Дарашэвіч // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2011. – С. 10–80.

3. *Жуковский, В. И.* Теория изобразительного искусства / В. И. Жуковский. – СПб. : Алетейя, 2013. – 495 с.

4. *Калацэй, В.* Дзейнасць па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў / В. Калацэй //Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. Вып. 7. / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2010. – С. 277– 283.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ